ДЗЯРЖАЎНАЯ УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА №155 Г. МІНСКА»
220116, г. Мінск, праспект газеты “Праўда”, 52, (8017) 270-21-09

# ЯСКРАВЫ СВЕТ МАІХ ПАЧУЦЦЯЎ

**Аўтар:** Анікові́ч Назар
Русланавіч,
10 гадоў
ДУА «Сярэдняя школа №155
г. Мінска», 5 “Б” клас

Мінск 2021

## Яскравы свет маіх пачуццяў

Пачуцці… Што такое пачуцці? Давайце пра ўсё па парадку.

Для мяне, для хлапчука дзесяці гадоў, — гэта цэлы свет знаёмых і нёзнаемых момантаў, якія прысутнічаюць у кожнага з нас. У любым чалавеку жыве мноства эмоцый і пачуццяў. Гэта могуць быць радасць, шчасце, захапленне, крыўда, нянавісць і іншыя. У залежнасці ад жыццёвай сітуацыі кожная эмоцыя нагадвае пра сябе. Калі шчыра, то я трохі зайздрошчу людзям, якія ўмеюць хаваць і кантраляваць свае пачуцці. Я належу да ліку тых людзей, якім кантроль даецца вельмі складана. Незаўсёды нават пазітыўныя эмоцыі аказваюцца дарэчнымі. Напрыклад, я магу гучна засмяяцца ў кафэ. І гэта не значыць, што я дрэнна выхаваны. Я аддаю сабе справаздачу, як сябе трэба весці ў грамадскіх месцах, але часам пачуцці апаноўваюць так моцна, што стрымаць іх немагчыма. Ох, гэтыя пачуцці! Яны – шчырыя і яскравыя, самыя некантралюемыя.

Я знаёмы з некаторымі людзьмі, якіх адольваюць негатыўныя пачуцці. Ім складана хаваць сваю незадаволенасць, крыўду, стрымліваць свае паводзіны, якія дзейнічаюць, нібы запалкі. Усё ж, на маю думку, чалавеку важна кантраляваць сябе, асабліва калі гаворка заходзіць аб пачуццях іншых людзей. Не ўсё ў нашым жыцці атрымліваецца так, як мы хочам. Часта нам хочацца адшукаць скарбонку са станоўчымі эмоцыямі. Таму добра, калі чалавек здольны “дарыць” свае цёплыя пачуцці. Так, любоў мы адчуваем з асаблівай пяшчотай у сэрцы. Любоў да бацькоў, сяброў, жывёл, да радзімы… Гэтым, безумоўна, трэба дзяліцца!

Гэтак жа мне пашчасціла стаць сябрам і для тых неверагодных людзей, у якіх часцей успыхваюць пачуцці весялосці і радасці. Для мяне “скарбонкі жыццёвага запалу” – гэта лепшая катэгорыя людзей. Я сам імкнуся дарыць людзям радасць, таму мне вельмі камфортна ў іх асяроддзі. Я лічу, што чалавек без эмоцый – не чалавек. Трэба радавацца кожнаму дню, нібы апошняму, верыць, што ўсё будзе добра. Згодны? Вядома, ніхто не застрахаваны ад дрэнных здарэнняў. У тыя моманты, калі чалавека апаноўвае сум, важна не саромецца выказаць жаль і спачуванне, не даць чалавеку замкнуцца ў сабе. Галоўнае – быць шчырым у сваіх адчуваннях, не хавацца ад свайго ўнутранага свету. Занятыя сваімі праблемамі і клопатамі, мы нават не думаем, што камусьці неабходна нашая падтрымка. “Першая дапамога” для чалавека – гэта нашыя эмоцыі і пачуцці, што з’яўляюцца вельмі карыснымі сродкамі, бо зыходзяць яны з глыбіні. Іх магчыма схаваць ад наваколля, але ці трэба?

Я лічу, што варта паказваць свае пачуцці, быць, як кажуць, “празрыстым, як кропля”, бо, калі чалавек паказвае, які ён на самой справе, тады ён сапраўды шчыры. У наш час гэта вельмі значная і такая рэдкая якасць.

Вось мая парада: не трымайце свае пачуцці, прызнавайцеся ў каханні, дапамагайце іншым, рабіце правільныя і няправільныя ўчынкі, і тады ў вашым жыцці будзе менш расчараванняў і больш спрыяльнай дабрыні, як у мяне, маім свеце пачуццяў.

ДЗЯРЖАЎНАЯ УСТАНОВА АДУКАЦЫІ

«Гімназія № 38 г. Мінска»

# ЯСКРАВЫ СВЕТ МАІХ ПАЧУЦЦЯЎ

**Аўтар:** Кандрашова  Мілана Ільінічна,

3 «А» клас

Мінск 2021

***

Сябра, ведаеш, чаму
Больш за усё чакаю лета?
Я, канешне, адкажу,
Дык, паслухай жа пра гэта.
(Будзе то нашым сакрэтам)

Развітаемся з вясной –
Хутка я пачну збірацца
Да бабулечкі маёй,
Каб у Нарачы купацца.

Наша возера – краса!
У кожнай хвалі – таямніца,
Нібы дзеўчыны каса,
Распусцілася ў вадзіцу.

Там жывуць мае сябры -
Любім мы гуляць па лесе.
Ён у нас такі стары,
Ведае пра ўсё на свеце!

Ён лісточкам шапатне
Пра лясных жывёл и птушак.

Ён паведае табе

Тайну ўсіх яловых шышак.

Як мне любы той куток,

Пра які складалі вершы,

І Разімы закуток

Не змяню ніяк на іншы!

УПРАВЛЕНИЕ ПО ОБРАЗОВАНИЮ

«АДМИНИСТРАЦИИ ПЕРВОМАЙСКОГО РАЙОНА г. МИНСКА»

ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ

«СРЕДНЯЯ ШКОЛА № 177 г. МИНСКА»

ИНТЕРНЕТ-КОНКУРС ЛИТЕРАТУРНЫХ РАБОТ

«АЗБУКА ПАЧУЦЦЯЎ»

ТЕМА РАБОТЫ: «Я так адчуваю мір»

Левончик Ульяна Максимовна

ГУО «Средняя школа № 177 г Минска»

4 «Б» класс

Минск 2021 г.

**Я так чувствую мир**

Я чувствую этот мир по-своему,
Он - красивый, светлый и прикольный!
Нет в этом мире зла и печали,
Есть только радость, любовь,
Нет отчаяния

Есть в этом мире родные, друзья,
Ведь все в этом мире мы - одна семья!

Вот этой ночью звезда упадет,
Исполнит желанье любое!
Может, хочешь скоростной самолет?
Или что-то другое?

Здесь оптимистом быть нужно всегда,
Ведь мир не для слабых духом!
Не сдавайся ты  никогда
Закон жизни суровый к людям!

Увидел преграду и все!
Ты сдался, упал, а подниматься не стал
Нет! Так нельзя! Вставай и борись до конца!

Только тогда ты получишь свое!

Любовь, удачу, здоровье -

Весь целый набор!

Мы сами свой уникальный мир создаем,

В котором потом мы и живем!

ДУА «Пачатковая школа №29 г. Мінска імя братоў Сянько»
г.Мінск, вул. Сонечная, 3

Республиканский интернет-конкурс литературных работ
«АЗБУКа пачуццяў»

в рамках проекта «Script.Art.by»

**Я так адчуваю мір**

Аўтар:
Хоміч Сафія Дзмітрыеўна,
3 «А» клас

Минск 2021

**Я так адчуваю мір**

Яскравы свет вакол мяне!
Расплюшчу вочы я ў сне,
Пачуцці розныя я маю!

Вось раніца, і адчуваю я
Пяшчоту мамы з татам.
Напоўніць радасцю мяне,
Калі я абдымаюсь з братам.

Збіраю ў школу я партфель –
Бярэ мяне турбота.
А ў ім цукерачка ляжыць –
Матуліна забота.

У школу вуліцай іду,
Хвалююся, спяшаюся.
Вось бачу сябра я свайго
І моўчкі ўсміхаюся.

І радасна на сэрцы мне,
Калі ў акенцы сонца.
І не бярэ журба мяне,
Што дожджык л’е бясконца.

Хай кажуць зайздрасць, страх ды гнеў
Вакол нас атачаюць.
Я ж бачу іншае зусім.
Інакш свет адчуваю!!!

Упраўленне па адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна г. Мінска
Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 111 г. Мінска»

Рэспубліканскі інтэрнэт-конкурс літаратурных работ
«АЗБУКа пачуццяў»
у рамках праекта «Script.Art.by»

**ТЭМА: «ДЛЯ МЯНЕ ГАЛОЎНАЕ ПАЧУЦЦЕ – ГЭТА...»**

Аўтар:
Цяценькіна Марыя Дзмітрыеўна,
10 гадоў, 5 "Г" клас
Кіраўнік:
Макарэнка Аксана Васільеўна.
+375 29 2297868

Мінск 2021

## Для мяне галоўнае пачуццё – гэта любоў

Што такое пачуцці? Якімі яны бываюць? Кожны чалавек нараджаецца з новымі пацуццямі, пражывае сваё жыццё і штодзённа адкрывае ў сябе нешта нязведанае, а ў канцы свайго шляху кожны адчувае, як гавораць, усё на свеце.

Галоўнае пачуццё для мяне – гэта любоў. Яна натхняе мяне. І самае дзівоснае, што ёю  прасякнута ўсё маё жыццё, кожны дзень, кожная хвіліна… Я вельмі люблю сваіх добрых і клапатлівых бацькоў. Яны мяне падтрымліваюць і разумеюць. Разам з імі я адчуваю сябе ў бяспецы. Таксама вельмі люблю сваю сястру. Штодзень я вяртаюся дадому, у сваю любімую кватэру, дзе ўсё так душэўна і цёпла, так утульна і знаёма. Тут мая сям'я. Калі наша сям'я разам – гэта самы лепшы час у маім жыцці.

Любоў праяўляецца кожны дзень і да ўсяго: да школы, да сяброваk, да прыроды і Радзімы. Я вельмі люблю хадзіць у школу, таму што там цікава, таму што там я сустракаю сваіх аднакласніц, з якімі ў мяне добрыя адносіны. Мне падабаецца праводзіць час разам з сяброўкамі, я адчуваю ад іх цеплыню і ўзаемаразуменне.

Кожны чалавек любіць і шануе кагосьці. Любоў праяўляецца ва ўчынках, сэрца напаўняецца дабрынёй, калі цябе сапраўдна любяць. Ад гэтага пачуцця адразу з'яўляецца сіла і натхненне, ад яго залежаць і ўсе іншыя пачуцці чалавека. У маім жыцці я штодзень адчуваю шчасце, радасць, спачуванне, клопат. Але акрамя такіх прыемных пачуццяў сустракаюцца і страх, нянавісць, адчай і смутак. Не вельмі прыемныя пачуцці, я вам скажу. Кожнае пачуццё дапаўняе нас, робіць нас тымі, хто мы ёсць.

Я дакладна ведаю, што толькі любоў робіць нас шчаслівымі, толькі тады чалавек шчаслівы, калі яго любяць і калі сам ён любіць, – толькі тады ён будзе жыць і радавацца!

Республиканский интернет-конкурс литературных работ
«АЗБУКа пачуццяў»
в рамках проекта «Script.Art.by»

# Для мяне галоўнае пачуццё – гэта…

Автор:
Ясько Анастасия Андреевна,
государственное учреждение образования
«Средняя школа № 114 г. Минска
имени Симона Боливара»
4 «А» класс

Минск
2021

## Для мяне галоўнае пачуццё – гэта…

Хоць мне яшчэ толькі дзевяць гадоў, але ўжо мне вядомы многія пачуцці: радасць ад добрай адзнакі, спачуванне да хворых і пакінутых, нянавісць да фашыстаў, замілаванне прыгожымі краявідамі…

Але ёсць адно пачуццё, якое я лічу галоўным у сваім жыцці. Яго я хачу пранесці праз гады да самай старасці. Гэта пачуццё ўдзячнасці. Мне здаецца, што чалавек сталее, уяўляе сабе чалавекам толькі тады, калі ён разумее, каму і чым ён абавязаны.

Напрыклад, я…

Канечне, як і ўсе дзеці, перш-наперш я ўдзячна сваім маме і тату. За тое, што падаравалі мне жыццё. За тое, што акружылі клопатам і пяшчотай, паказалі свет і навучылі разумець і любіць яго, напоўнілі маё жыццё цікавым зместам: паходамі і паездкамі, сумеснымі гульнямі і заняткамі спортам.

У нас шчаслівая сям’я. Я рада, што ў мяне ёсць маленькі брацік Радзівон. З намі жывуць сабака і кот. Я займаюся ў спартыўнай секцыі і танцавальным гуртку.

Мае бацькі ставяцца да мяне з даверам і паразуменнем. Нават, калі адзнака не вельмі добрая або забудуся пра нейкае даручэнне, не караюць, а імкнуцца разабрацца ў сітуацыі і выправіць яе.

А яшчэ бацькі мяне навучылі марыць і верыць у дасягненне мэты.

Вось як гэта было…

Я люблю назіраць за птушкамі: як лёгка ім удаецца ўзнімацца ў паветра, усё разглядаць з вышыні нябёсаў, пералятаць за тысячы кіламетраў у розныя краіны. Я шмат разоў надакучвала бацькам сваімі фантазіямі: вось бы паляцець, як птушка…

І аднойчы на адпачынку тата пабудзіў нас раніцай і кудысьці павёз. Неўзабаве мы апынуліся ў парапланерным клубе, дзе я ўпершыню разам з татам паднялася на параплане ў паветра. Проста як птушка! Пад намі праплывалі палі і лясы, рэчкі і вёскі. Твар казытаў лёгкі ветрык. У мяне нават голас знік ад захаплення. Потым, ужо на зямлі, я абдымала і тату, і маму (за тое, што дазволіла гэтую прыгоду). І нават заплакала ад шчасця. Тата ажыццявіў маю мару. Дзякуй табе, тата, лепшы тата ў свеце!

Цяпер я дакладна ведаю: калі верыш у сваю мару, яна спраўджваецца. Я зноў і зноў паўтараю на трэніроўцы выпад са шпагай, зноў і зноў адпрацоўваю мудрагелістае па ў танцы, бо веру: у мяне ўсё атрымаецца!

… Мая бабуля Валя жыве ў невялікім горадзе Мікашэвічы, што на Брэстчыне. Мы часта наведваем яе. У яе хаце заўсёды смачна пахне пірагамі, якія яна пячэ да нашага прыезду. Бабуля і мяне вучыла мясіць цеста. Яна гаворыць па-беларуску і мне прывіла цікавасць і любоў да роднай мовы. Ад яе я пачула ўпершыню “кветка”, “жыта”, “надвор’е”, “лялька”, “дачушка”, “унучачка”… Бабуля Валя ведае шмат народных песен, умее вышываць крыжыкам. Зімовымі вечарамі і я цяпер часам сажуся за вышыванне, спяваючы любімую “Купалінку”.

Дзякуй табе, мая нястомная і клапатлівая бабуля!

… У мяне шмат сяброў. Гэта і хлопчыкі, і дзяўчынкі. Я вясёлая па характары, і сябры мае такія ж. Мы заўсёды прыдумваем розныя гульні, сустракаемся ў школе, нават у суботу, калі няма заняткаў. Але мае сябры Яна, Вераника Ваня, Максім могуць і падтрымаць, калі мне бывае сумна, і дапамагчы. Калі я хварэла, яны кожны дзень падбадзёрвалі мяне сваімі пасланнямі.

Дзякуй вам, мае сябры! Без вас маё  жыццё было б шэрым і тужлівым.

Але ў школу я спяшаюся не толькі да сяброў, але і да сваёй настаўніцы Таццяны Леанідаўны. У яе ў запасе шмат цікавых гісторый. Самы складаны вучэбны матэрыял яна прыпраўляе смяшынкамі і загадкамі. Ад гэтага заняткі пралятаюць вельмі хутка. Нават калі мы, бывае, свавольнічаем, або хтосьці не выканаў дамашняе заданне, і, здаецца, зараз маланкі паляцяць з вачэй настаўніцы, усё роўна мы ведаем, што праз хвіліну бура сцішыцца і надвор’е ў класе зноў будзе ясным і лагодным.

Дзякуй Вам, Таццяна Леанідаўна, за тое, што навучылі мяне вучыцца, любіць сваю школу і Радзіму!

Амаль кожны дзень я прачынаюся ў добрым настроі. Ціхенька муркае пад маім ложкам кот Барыс. З кухні чуюцца пах сняданка і галасы мамы і брацiка. Пад вокнамі тата заводзіць машыну. Па дарозе на працу ён падвязе мяне ў школу, а маму з Родзікам у садок. Яны там працуюць: мама – выхавальніцай, а Радзівон – выхаванцам.

Па дарозе мы будзем спяваць пад акампанімент радыё свае любімыя песні. А ў школе мяне чакаюць сябры і настаўнікі, новыя веды і ўражанні.

У мяне ёсць яшчэ адна мара: каб усе людзі, якім я ўдзячна за іх любоў і сяброўства, клопат і павучанні, былі шчаслівымі і здаровымі.

Я мяркую, што здолею па прыкладзе дарагіх мне людзей таксама заслужыць у свой адрас цёплыя словы “Дзякуй, Насця!”